# Пачатак і заканчэнне Другой сусветнай вайны

## Германія, 1945

Урок
90 хвілін

Дадатковы матэрыял

Першакрыніцы

# Першакрыніцы (Германія)

**29 красавіка 1945 года Адольф Гітлер напісаў свой палітычны запавет, у якім распавёў пра свае думкі і намеры за апошнія некалькі гадоў. Крыху пазней Гітлер здзейсніў самагубства. Ягонае самагубства азначала фактычны канец Другой сусветнай вайны і капітуляцыю Трэцяга рэйха.**

## Палітычны запавет Гітлера, 1945 г.

[...] Гэта няправільна, быццам я ці хтосьці іншы ў Германіі жадаў у 1939 г. вайны. Яе жадалі і развязалі выключна інтэрнацыянальныя дзяржаўныя дзеячы альбо яўрэйскага паходжання, альбо якія працавалі на яўрэйскія інтарэсы. Я ўносіў мноства прапаноў па скарачэнні і абмежаванні ўзбраення, якія будучыя пакаленні не змогуць вечна адмаўляць, каб ускласці адказнасць за пачатак гэтай вайны на мяне. Далей, я ніколі не хацеў, каб пасля злашчаснай Першай сусветнай вайны паўстала Другая сусветная вайна супраць Англіі ці, тым больш, супраць Амерыкі. Пройдуць стагоддзі, але з руін нашых гарадоў і помнікаў мастацтва будзе пастаянна вырастаць усё новая нянавісць да таго народа, які, у рэшце рэшт, нясе адказнасць за ўсё гэта, да таго народа, якому мы абавязаны ўсім гэтым, – інтэрнацыянальнаму яўрэйству і яго памагатым. Яшчэ за тры дні да таго, як распачалася германа-польская вайна, я прапанаваў брытанскаму амбасадару ў Берліне рашэнне германа-польскай праблемы – як і ў выпадку з Саарскай вобласцю – пад міжнародным кантролем. Гэтая прапанова таксама не можа адмаўляцца. Але яна была аспрэчаная, таму што ўплывовыя колы англійскай палітыкі жадалі вайны, а збольшага падганяліся да яе арганізаванай інтэрнацыянальным яўрэйствам прапагандай. Але я не пакідаў таксама сумневы і на той конт, што, калі народы Еўропы разглядаюцца як пакеты акцый для інтэрнацыянальных фінансавых і прамысловых змоўшчыкаў, будзе прыцягнуты да адказнасці і той народ, які з’яўляецца адзіным вінаватым гэтай смяротнай вайны: яўрэйства! [...]

Пасля шасцігадовай барацьбы, якая, нягледзячы на ўсе няўдачы, увойдзе ў гісторыю як самы слаўны і адважны выраз жыццёвай сілы нямецкага народа, я не магу адарваць сябе ад таго горада, які з’яўляецца сталіцай рэйха. Паколькі сілы нашы занадта слабыя, каб і далей вытрымліваць націск ворага менавіта тут, а ўласны супраціў паступова абясцэньваецца гэтак жа аслеплымі, як і бесхарактарнымі суб’ектамі, я хацеў бы застацца ў гэтым горадзе, падзяліць лёс з тымі мільёнамі іншых людзей, якіх ужо напаткала смерць. Акрамя таго, я не хачу трапіць у рукі ворагаў, якім, на пацеху імі нацкаванымі масам, патрэбны новы, пастаўлены яўрэямі, спектакль. А таму я вырашыў застацца ў Берліне і тут, з уласнай волі, абраць смерць у той момант, калі ўбачу, што я больш не змагу быць фюрарам і рэйхсканцлерам. Я паміраю з радасным сэрцам, ведаючы пра невымерныя дзеянні і здзяйсненні нашых салдат на фронце, нашых жанчын у тыле, нашых сялян і рабочых, а таксама пра бяспрыкладны ўдзел ва ўсім гэтым моладзі. Усё гэта носіць маё імя і не мае аналагаў у гісторыі.

Тое, што ўсім ім я выказваю падзяку, якая ідзе ад усяго сэрца, гэтак жа само сабою зразумелае, як і маё жаданне, каб яны ні ў якім разе не спынялі барацьбу, а ўсюды працягвалі весці яе супраць любых ворагаў Бацькаўшчыны [...]

Перад сваёй смерцю я выганяю былога рэйхсмаршала Германа Герынга з партыі і пазбаўляю яго ўсіх правоў, якія маглі б выцякаць з указа ад 29 чэрвеня 1941 года, а таксама з маёй заявы ў рэйхстагу ад 1 верасня 1939 года. Я прызначаю замест яго грос-адмірала Дэніца рэйхспрэзідэнтам і вярхоўным галоўнакамандуючым вермахта. Перад сваёй смерцю я выганяю былога рэйхсфюрара СС і імперскага міністра ўнутраных спраў Генрыха Гімлера з

партыі, а таксама пазбаўляю яго ўсіх дзяржаўных пасад. [...] Герынг і Гімлер без майго ведама вялі таемныя перамовы з ворагам і, насуперак маёй волі, распачалі спробу ў парушэнне закона захапіць уладу ў дзяржаве ў свае рукі, чым зрабілі краіне і ўсяму народу неаглядную шкоду, зусім не кажучы ўжо пра зневажанне вернасці мне асабіста. Ад усіх немцаў, ад усіх нацыянал-сацыялістаў, ад усіх мужчын і жанчын, ад усіх салдат вермахта я патрабую, каб яны былі верныя новаму ўраду і новаму прэзідэнту і слухаліся яго да самай смерці. Але перш за ўсё я абавязваю кіраўніцтва нацыі і грамадства самым строгім чынам выконваць нашы расавыя законы і аказваць бязлітасны супраціў сусветнаму атручвальніку ўсіх народаў – інтэрнацыянальнаму яўрэйству.

Берлін, 29 красавіка 1945 г., 4 гадзіны; Адольф Гітлер

654 словы

Крыніца: W. Lautemann, M. Schlenke (Hg.), Geschichte in Quellen, Weltkriege und Revolutionen 1914-1945, Band 5, München 1961, S. 545 ff., https://www.geschichte-abitur.de/quellenmaterial/quellen-drittes-reich/politisches-testament-hitlers-1945, дата апошняга наведвання: 11.01.2021 г.